# ЗВАРОТ МІЖДЗЯРЖАЎНАГА САВЕТА ПА ПЫТАННЯХ АГРАРНАЙ НАВУКІ І ІНФАРМАЦЫІ Ў АГРАПРАМЫСЛОВЫМ КОМПЛЕКСЕ КРАІН САДРУЖНАСЦІ НЕЗАЛЕЖНЫХ ДЗЯРЖАЎ ДА МІЖУРАДАВАГА САВЕТА ПА ПЫТАННЯХ АГРАПРАМЫСЛОВАГА КОМПЛЕКСУ КРАІН СНД

Міждзяржаўны савет па пытаннях аграрнай навукі і інфармацыі ў аграпрамысловым комплексе краін садружнасці незалежных дзяржаў на сваім пасяджэнні 30 чэрвеня 1994 г. у Мінску, абмеркаваўшы перспектывы развіцця аграрнай навукі ў краінах СНД, адзначае:

Ступень развіцця галін аграпрамысловага комплексу ўсіх дзяржаў СНД у вызначальнай ступені ўплывае на эканамічную, палітычную і сацыяльную абстаноўку ў грамадстве і знаходзіцца ў прамой сувязі з навуковым забеспячэннем. На жаль, узровень вытворчасці і той стан, у якім цяпер апынулася аграрная навука, выклікаюць сур'ёзную трывогу. Сельская гаспадарка перажывае зацяжны глыбокі крызіс, характэрнай рысай якога з'яўляецца рэзкі спад вынікаў гаспадарчай дзейнасці, зніжэнне навукова-тэхнічнага патэнцыялу. Негатыўныя тэндэнцыі ўсё больш набываюць устойлівы характар. Застаецца незапатрабаванай большасць навуковых распрацовак, зніжаецца навукаёмістасць вытворчасці, канкурэнтаздольнасць.

Міждзяржаўны савет аднадушна падкрэслівае, што існуючае становішча з фінансаваннем згубна ўздзейнічае на работу навуковых устаноў, творчых калектываў і школ, развіццё прыярытэтных напрамкаў даследаванняў. Практычна прыпыняецца падрыхтоўка навуковых кадраў, спынілася абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы навуковых устаноў, уключаючы элементарнае тэхнічнае лабараторнае абсталяванне.

Амаль поўнасцю паралізавана інфармацыйнае забеспячэнне з усімі далёка ідучымі негатыўнымі наступствамі. Органы інфармацыі, бібліятэкі з прычыны рэзкага скарачэння выдання навуковай літаратуры і іншых інфармацыйных крыніц спынілі папаўненне сваіх фондаў.

На вялікі жаль, вучоны-аграрнік аказаўся сацыяльна менш абароненым у параўнанні з іншымі катэгорыямі працоўных, праца яго стала непрэстыжнай, заработная плата застаецца на нізкім узроўні. Усё гэта стымулюе адток вядучых навукоўцаў у іншыя, уключаючы і камерцыйныя, структуры, адмоўна ўплывае на прыток перспектыўных маладых людзей у навуку.

Міждзяржаўны савет па пытаннях аграрнай навукі і інфармацыі ў АПК краін СНД канстатуе, што аграрнай навуцы рэальна пагражае раз-

бурэнне каштоўнага капіталу грамадства, на адраджэнне якога спатрэбіцца шмат часу і сродкаў.

Улічваючы выкладзенае, Міждзяржаўны савет па пытаннях аграрнай навукі і інфармацыі ў АПК краін СНД звяртаецца з настойлівай просьбай да Міжурадавага савета па пытаннях аграпрамысловага комплексу краін СНД у самыя кароткія тэрміны разгледзець і вырашыць пытанні бюджэтнага фінансавання аграрнай навукі ў аб'ёмах, неабходных для прыярытэтнага і паступовага развіцця навукі; падняць заработную плату навуковых супрацоўнікаў да ўзроўню, які забяспечвае іх сацыяльную абарону і прэстыжнасць творчай працы ў адпаведнасці з яе значнасцю для развіцця грамадства; вызваліць навуковыя і вышэйшыя навучальныя ўстановы ад падаткаў, плацяжоў, пошлін, у тым ліку і на валютныя сродкі, атрыманыя ад знешнеэканамічнай дзейнасці.

По даручэнні Міждзяржаўнага савета па пытаннях аграрнай навукі і інфармацыі ў аграпрамысловым комплексе краін СНД

Прэзідэнт Акадэміі аграрных навук
Рэспублікі Беларусь акадэмік

*В. С. Антанюк*